ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Беларускі ўніверсітэт

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

№ 17 (1015) ● ЧАЦВЕР, 24 мая 1973 г. ● Цана 2 кап. ● Год выдання XXXVIII

СЁННЯ Ў НУМАРЫ:

● Весткі з факультэтаў ● На камсамольскіх сходах ● У заводскіх аўдыторыях ● Свята братняй Балгарыі ● У нашых музеях ● Экскурсіі і падарожжы ● Спорт.

# ПА УНІВЕРСІТЭТУ

У панядзелак адбылося пасяджэнне рэктарата. Абмеркаван даклад в. а. загадчыка кафедры педагогікі і псіхалогіі **М. У Піскунова** «Аб мерапрыемствах па паляпшэнню педагагічнай падрыхтоўкі студэнтаў універсітэта».

Старшыня прафкома М. М. Дрозд, дэкан падрыхтоўчага факультэта М. К. Гарбачоў, дэкан па навучанню замежных грамадзян К. К. Герман інфармавалі рэктарат аб тым, што робіцца па арганізацыі летняга адпачынку савецкіх і замежных студэнтаў.

Аб падрыхтоўцы да летняй экзаменацыйнай сесіі і яе правядзенні даложыў начальнік вучэбнага аддзела В. С. Далгарукаў.

●

У партыйных арганізацыях БДУ ідуць справаздачна-выбарныя сходы. Камуністы падводзяць вынікі працы за прайшоўшы перыяд, намячаюць напрамкі дзейнасці на будучае. Сходы ўжо адбыліся на філфаку, матфаку, хімфаку і іншых універсітэцкіх падраздзяленнях.

●

Пазаўчора паспяхова прайшла абарона доктарскай дысертацыі дацэнтам кафедры геаметрыі Анатолем Сямёнавічам Фядэнкам. Яго работа — «Прастора з сіметрыямі» — атрымала станоўчы водгук. Як адзначылі апаненты, дактары навук з Вільнюса і Адэсы тт. Блізнікас і Сінюкоў, работа выканана на высокім навуковым узроўні, у ёй выкарыстаны разнастайныя сучасныя метады, яна ўтрымлівае шэраг новых ідэй і важных вынікаў па цяжкіх пытаннях сучаснай геаметрыі. Высокую ацэнку даў рабоце член-карэспандэнт АН БССР У. П. Платонаў.

Па аднадушнаму меркаванню савета аўтар работы дастойны прысуджэння вучонай ступені доктара фізіка-матэматычных навук.

Сярод матэматыкаў Анатоль Сямёнавіч Фядэнка вядомы не толькі сваімі даследаваннямі па геаметрыі, як аўтар і сааўтар цэлага раду падручнікаў і вучэбных дапаможнікаў, але і як цудоўны педагог, выхавацель маладых вучоных.

●

Зацверджаны ў вучонай ступені кандыдата хімічных навук:

**Будкевіч** Барыс Аляксандравіч;

**Ціханаў** Аляксандр Сямёнавіч;

**Карабан** Аляксандр Аляксандравіч.

# ДАВЕР'Е

**Універсітэцкі калектыў аднадушна вылучыў кандыдатамі ў дэпутаты гарсавета сакратара Мінскага гаркома КПБ Т. Ц. Дзмітрыеву, прарэктара БДУ А. Я. Малышава, студэнтку юрфака Т. К. Кір'янаву. Кандыдатамі ў дэпутаты раённага Савета названы прарэктар БДУ Л. В. Валадзько, дырэктар бібліятэкі І. У. Арэхоўская, выкладчык А. М. Крамнік, студэнты Л. Т. Агароднік і А. А. Сакалоўскі.**

«За гады вучобы праявіла сябе як здольная студэнтка, актыўны ўдзельнік грамадскага жыцця, добры таварыш... Апошнюю сесію здала выдатна. З'яўляецца членам камсамольскага бюро II курса юрыдычнага факультэта... Карыстаецца аўтарытэтам і павагай сярод студэнтаў, мае вялікія арганізатарскія здольнасці...»

За гэтымі радкамі характарыстыкі Тані Кір'янавай ніяк не паўстае знешні воблік...

Нешта няўлоўна-дзіцячае ў твары: яно ці то ў крыху прыпухлых вуснах, ці то ў вачах, у шчырасці якіх не засумняваешся. Яна — і раптам дэпутат... Так, яна на працягу двух год добра бучыцца, і грамадская яе дзейнасць пачалася з першага семестра знаходжання ва універсітэце. А, можа, раней — калі працавала ў сваёй школе ў Брэсце, не прайшоўшы па конкурсу ў першы год пасля 10-га класа. Потым жа быў яшчэ адзін год працы — у Брэсцкім абкоме прафсаюзаў. І гэты год можна залічваць у стаж яе грамадскай дзейнасці. Але ўсё роўна — зусім яшчэ малады кандыдат у дэпутаты. Ёй 21 год. Таня яшчэ не зусім і ўсвядоміла, якое высокае давер'е ёй аказана.

— Гэта ўсё так нечакана...

Цяпер крыху прывыкла да думкі, што яна — кандыдат у дэпутаты гарадского Савета дэпутатаў працоўных. А калі толькі даведалася, вельмі хвалявалася.

— Не ведала нават, як адказаць на такі гонар... Безумоўна, буду старацца апраўдаць давер'е. Я вельмі ўдзячна за яго, але, чэснае слова, так хвалююся. Спадзяюся, што мне дапамогуць мае выбаршчыкі.

Яе выбаршчыкі —студэнты. Каму, як не ім, лепш за ўсіх вядомы здольнасці і заслугі Тані. Выдатніца, добры і чулы таварыш, умелы арганізатар. Так пра яе гавораць і ў дэканаце, і на курсе.

І, напэўна, выбаршчыкі не памыліліся, назваўшы Таню Кір'янаву дастойнай звання дэпутата.

К. ТУМАР.

# ГОСЦІ З ГДР

Вось ужо каторы год у канцы красавіка студэнты філфака БДУ сустракаюць сваіх равеснікаў з Іенскага універсітэта. Моладзь з ГДР наведвае нашу навучальную ўстанову, каб расшырыць свае веды ў галіне рускай мовы і літаратуры, бліжэй пазнаёміцца з жыццём, культурай, традыцыямі нашага народа.

За дваццаць дзён можна шмат пазнаць і многае паспець зрабіць. Таму кожны дзень знаходжання нямецкіх студэнтаў у Мінску быў распісан па гадзінах і мінутах. У святочны дзень 1 Мая разам з савецкімі студэнтамі ў калоне дэманстрантаў прайшлі па Ленінскаму праспекту і дзесяць прадстаўнікоў Саюза свабоднай нямецкай моладзі.

На факультэце замежным сябрам быў прачытан шэраг лекцый кваліфікаванымі спецыялістамі мовазнаўчых і літаратуразнаўчых дысцыплін. Часта можна было заўважыць нямецкіх студэнтаў і за падручнікамі ў бібліятэцы імя У. І. Леніна, там яны рыхтавалі свае дыпломныя работы.

У вольны ад вучобы час савецкія і нямецкія студэнты наведвалі кіно, тэатры. Пабывалі яны ў Вязынцы — на радзіме песняра беларускага народа Янкі Купалы, наведалі музеі Якуба Коласа і гісторыі Вялікай Айчыннай вайны.

Вялікае ўражанне на гасцей аказалі паездкі ў Хатынь, Брэст, на Курган Славы.

За дваццаць дзён нашы і нямецкія студэнты сталі сапраўднымі сябрамі. На развітанне мы гаварылі: «Да хуткай сустрэчы!», бо ў верасні сённяшнія гаспадары будуць гасцямі Іенскага універсітэта.

І. РОЎДА.

# Весткі з факультэтаў

## ГІСТФАК

Добра і выдатна ацэньваецца звычайна піянерская практыка ў студэнтаў гістфака.

Нядаўна ў камітэт камсамола факультэта прыйшло пісьмо, у якім дырэкцыя і калектыў настаўнікаў СШ № 12 г. Мінска выказалі ўдзячнасць студэнтам II курса В. Андруховічу, А. Бабруйка, А. Руклінскаму, В. Кішко, В. Харыну, А. Якіменка за вялікую і цікавую піянерскую работу, праведзеную ў час практыкі.

## ХІМФАК

Адкрыты партыйны сход абмеркаваў пытанні падрыхтоўкі да новага навучальнага года. З дакладам выступіў дэкан факультэта Ф. М. Капуцкі. Былі адзначаны дасягнутыя поспехі, за якія факультэт атрымаў пераходны Чырвоны сцяг у спаборніцтве ў гонар 50-годдзя ўтварэння СССР. Указаны недахопы ў выхаваўчай рабоце ў інтэрнатах, у прыватнасці адсутнасць каардынацыі ў правядзенні гэтай работы. Выказаны думкі аб мэтазгоднасці адкрыцця на факультэце двух патокаў: навукова-педагагічнага і навукова-вытворчага. Мяркуецца, што гэта палепшыць падрыхтоўку спецыялістаў.

## БІЯФАК

«Свет такі цудоўны!» — так называецца фотаконкурс, які арганізаван на біяфаку. У конкурсе два туры. Вынікі першага падводзяцца ў маі, другога і канчатковыя — у лістападзе. Журы чакае цікавых расказаў у фотаздымках аб наваколынай прыгажосці.

## ЮРФАК

Адбылася сустрэча студэнтаў факультэта з дэпутатам Кастрычніцкага раённага Савета дэпутатаў працоўных г. Мінска прарэктарам па навуковай рабоце БДУ Л. В. Валадзько, які выступіў са справаздачай аб рабоце Савета.

# ПЫТАННІ, ЯКІЯ ХВАЛЮЮЦЬ

**«Адна з галоўных задач партыйнага кіраўніцтва камсамолам — павышэнне яго ролі ў камуністычным выхаванні падрастаючага пакалення, фарміраванне ў моладзі марксісцка-ленінскага светапогляду і класавай самасвядомасці, высокай ідэйнай перакананасці і непрымірымасці да буржуазнай ідэалогіі, выхаванне юнакоў і дзяўчат на гераічных традыцыях партыі і народа».**

(З даклада другога сакратара ЦК КПБ А. Н. Аксёнава на X пленуме ЦК КПБ).

Зыходзячы з задач, пастаўленых X пленумам ЦК КПБ, партком універсітэта прыняў рашэнне правесці ва ўсіх камсамольскіх арганізацыях сходы «Аб узмацненні ідэйна-палітычнай работы сярод студэнтаў».

Як адзначыў у сваім выступленні на камсамольскім сходзе юрыдычнага факультэта рэктар універсітэта У. М. Сікорскі, камсамольскія і партыйныя арганізацыі факультэтаў павінны звярнуць большую ўвагу на ідэйна-палітычную і выхаваўчую работу сярод моладзі універсітэта. Праводзіць шэраг канкрэтных мерапрыемстваў, дабіцца паляпшэння паспяховасці і дысцыпліны студэнтаў, прыцягваць іх да ўдзелу ў грамадскім жыцці.

Вялікая ўвага была звернута на пастаноўку навуковай работы. У яе арганізацыі ёсць яшчэ многа недахопаў. Так, напрыклад, афіцыйна на факультэце займаецца навуковай работай 400 студэнтаў з 776. Але на конкурс студэнцкіх навуковых работ было прадстаўлена ўсяго 32, з якіх толькі дзевяці прысвоена першая ступень.

Важнае значэнне мае актывізацыя жыцця камсамольскіх груп, асабістая работа з кожным камсамольцам. Калі б кожны праступак камсамольца стаў прадметам абмеркавання груп і курсаў, адміністрацыі універсітэта не прыходзілася б прымаць надзвычайныя меры.

Выступаючыя, члены камітэта камсамола, радавыя камсамольцы, гаварылі аб тым, як важна кожнаму камсамольцу мець пастаяннае грамадскае даручэнне. Гэта выхоўвае ў чалавеку высокую ідэйнасць і свядомасць.

Сходы камсамольцаў прайшлі на гістарычным, біялагічным, хімічным, матэматычным, фізічным факультэтах, факультэце прыкладной матэматыкі. На іх выступілі прадстаўнікі партыйнага камітэта і рэктарата, камсамольцы. Былі абмеркаваны праблемы, якія хвалююць кожнага: актыўнасць і пасіўнасць групы, паспяховасць і дысцыпліна, жыллё і быт і іншыя. У пастановах сходаў адзначаецца, што галоўная задача камсамольскіх арганізацый — выхоўваць ідэйна загартаваную моладзь, сапраўдных камуністаў.

# НА СЛУЖБЕ ВЕДАЎ

Шырокая прапаганда рашэнняў XXIV з'езда КПСС, дасягненняў савецкага народа ў розных галінах эканомікі, навукі і культуры — асноўны напрамак дзейнасці шматлікага калектыву універсітэцкага таварыства «Веды» ў сёлетнім годзе. Разнастайныя і шматгранныя формы гэтай дзейнасці. Гэта і універсітэты, школы, лекторыі, і навуковыя канферэнцыі, і агітпрабегі і г. д.

Толькі за першы квартал 1973 года лектары БДУ прачыталі для працоўных рэспублікі 1018 лекцый (а ўсяго за мінулы год—2500).

Члены таварыства «Веды» працягваюць плённую работу ў трох народных універсітэтах: навукова-атэістычным (г. Стоўбцы), прававых ведаў і педагагічных ведаў (г. Мінск). Вялікай папулярнасцю карыстаюцца лекторыі таварыства. Усяго іх— семнаццаць. Напрыклад, лекторый «Метады прыкладной матэматыкі і пытанні кіравання вытворчасцю» наведваюць каля 300 чалавек, у асноўным інжынерна-тэхнічныя работнікі вядучых прадпрыемстваў і навукова-даследчых устаноў сталіцы.

Больш 500 вучняў 10-х класаў Кастрычніцкага раёна — слухачы лекторыя «Гісторык-грамадазнаўца», які працуе пры БДУ ўжо чацвёрты год. Гэта пакуль што адзіны ў рэспубліцы лекторый такога профілю. Тут школьнікі расшыраюць веды па гісторыі КПСС, філасофіі, навуковаму камунізму і г. д. Сёлета для вучняў прачытаны такія цікавыя лекцыі, як «XXIV з'езд КПСС аб умацаванні шматнацыянальнай Савецкай дзяржавы», «Утварэнне СССР — перамога ленінскай нацыянальнай палітыкі», «Фарміраванне матэрыялістычнага светапогляду і шляхі пераадолення перажыткаў мінулага» і іншыя.

Не першы год вядуць вучоныя універсітэта лекторый «Паўправадніковыя прыборы», які наведваюць 50 інжынерна-тэхнічных работнікаў. Не меншай увагі заслугоўваюць і лекторыі «Фізіка паўправаднікоў, «Навука і тэхнічны прагрэс» у г. Дзяржынску і г. п. Станькава і многія іншыя.

З новага навучальнага года пачнуць працаваць лекторыі «Метады прыкладной матэматыкі», створаны на

(Працяг на 2-й стар.)



*НА ЗДЫМКУ: экзамен па нямецкай мове ў студэнтаў II курса аддзялення радыёфізікі прымае выкладчыца В. Б. КАВАЛЬ.*

*Фота Д. Чаховіча.*

# СПАДЗЯЕМСЯ НА ЛЕПШАЕ

Даўно ўжо агляды мастацкай самадзейнасці сталі традыцыйнымі. У чым іх карысць? Па-першае, падрыхтоўка да агляду і яго правядзенне згуртоўваюць людзей, даюць жыццё новым калектывам, прымушаюць кожнага з удзельнікаў клапаціцца аб агульных інтарэсах. Акрамя таго, гэта яшчэ адна магчымасць для выдатнага адпачынку.

Па-другое, агляды мастацкай самадзейнасці дапамагаюць людзям лепш выявіць свае здольнасці і таленты, удасканальваць сваё майстэрства.

Цяпер хацелася б закрануць некаторыя пытанні, якія датычаць падрыхтоўкі і правядзення аглядаў на юрыдычным факультэце. Сёлета мы падняліся ў параўнанні з мінулым годам на больш высокую прыступку, заняўшы II месца. Журы адзначыла і колькасны рост мастацкай самадзейнасці. Калі ў мінулы раз факультэт заняў прызавое трэцяе месца дзякуючы ў асноўным вакальна-інструментальнаму ансамблю «Ваганты», то цяпер паказалі цікавыя нумары харавы і танцавальны калектывы, жаночы вакальны квартэт і студэнцкі тэатр мініяцюр (СТМ).

Падрыхтоўка да агляду паказала, што наш факультэт, магчыма, як ні адзін іншы, мае самае галоўнае: у нас ёсць свае кіраўнікі хору, танцавальнага ансамбля, СТМ і свае акампаніятары. Акрамя таго, на нашым факультэце ёсць вялікі творчы рэзерв — студэнты, якія раней, да вучобы ва універсітэце, займаліся музыкай, танцамі, дэкламацыяй і г. д. Значыць, у нас ёсць усё для таго, каб стварыць выканаўчыя калектывы высокага ўзроўню. Аднак на гэтым шляху ёсць істотная перашкода — адсутнасць інструментаў. Так, сапраўды, з гэтай праблемай сутыкнуліся ўсе нашы калектывы. На факультэце няма ні баяна, ні акардэона, ні фартэпіяна, не гаворачы ўжо аб інструментах для вакальна-інструментальнага ансамбля. «Ваганты» ўжо не першы год прызнаюцца лепшым ансамблем ва універсітэце, але да гэтага часу яго кіраўніку прыходзіцца вышукваць людзей са сваімі інструментамі. Трэба звярнуць увагу і на тое, што мала студэнтаў нашага факультэта ўдзельнічае ў агульнауніверсітэцкай мастацкай самадзейнасці. А такія ж калектывы, як ансамбль танца «Крыжачок», харавая капэла і іншыя, заўсёды рады прыняць новых удзельнікаў. На іх рахунку многа выступленняў на сцэнах многіх гарадоў краіны і за мяжой, у іх цікавая і захапляючая праца. Акрамя таго, на сёлетнім аглядзе журы прыбаўляла факультэтам па тры балы за кожнага ўдзельніка агульнауніверсітэцкай самадзейнасці, а гэта адыгрывае важную ролю пры размеркаванні месц. Прыцягнуць студэнтаў да ўдзелу ва універсітэцкіх калектывах — адна з чарговых задач.

Мы спадзяемся, што ў будучым годзе, выкарыстаўшы ўсе свае вялікія магчымасці, наш калектыў зможа заняць першае месца.

**Ю. ПАДОЛЬСКІ.**

# НА СЛУЖБЕ ВЕДАЎ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.).

базе трох кафедр — ЭММ; вышэйшай матэматыкі і дыферэнцыяльных ураўненняў; аптымальнага кіравання і «Новае ў радыёэлектроніцы» — на базе кафедр фізічнага факультэта.

Значнае месца ў правядзенні лекцыйнай прапаганды займаюць цыклы лекцый. Іх характар і змест вызначаюцца саставам, інтарэсамі і падрыхтоўкай слухачоў. Такім чынам, здзяйсняецца дыферэнцыраваны падыход у распаўсюджванні ведаў сярод розных слаёў насельніцтва. На заводзе «Калібр», напрыклад, паспяхова завершан цыкл «Эканамічная палітыка партыі ў дзевятай пяцігодцы», а для выкладчыкаў сярэдніх спецыяльных устаноў у Мінскім палітэхнікуме чытаюцца лекцыі з цыкла «Новае ў фізіцы». У Мядзельскім раёне Мінскай вобласці на працягу многіх год сіламі членаў універсітэцкага таварыства «Веды» чытаюцца лекцыі аб прыродзе Нарачанскага краю, на Мінскім аўтазаводзе, у Белунівермагу і бібліятэцы БДУ праводзіцца цыкл «Па краінах і кантынентах». Студэнты універсітэта слухаюць цыкл лекцый «Майстры савецкага мастацтва» і «Знешняя палітыка Савецкага Саюза».

У сёлетнім навучальным годзе пры Заводскім РК КПБ г. Мінска працуе школа атэістаў. Гэта сёмая па ліку школа, якую вядуць члены таварыства «Веды» БДУ.

Актыўны ўдзел у прапагандзе прыродазнаўча-навуковых ведаў прымаюць музеі універсітэта: заалагічны і геалагічны. Іх з цікавасцю наведваюць школьнікі Мінска і Мінскага раёна. Тут ім расказваюць аб прыродзе Беларусі, яе жывёльным свеце. Добрымі лектарамі тут з'яўляюцца Б. Е. Нартыш-Блук, А. В. Кузняцова і іншыя.

Шырока ўвайшлі ў практыку арганізацыі таварыства «Веды» БДУ навукова-тэарэтычныя канферэнцыі па самых разнастайных праблемах. Цікава прайшла такая канферэнцыя ў Барысаўскім РК КПБ, у калгасе імя У. І. Леніна Стаўбцоўскага раёна, у Старых Дарогах, Салігорску, Мінскім сельскім раёне і многіх іншых кутках Беларусі. З настаўнікамі Стаўбцоўскага раёна, напрыклад, была праведзена канферэнцыя «Атэістычнае выхаванне ў школе». Тут разам з нашымі выкладчыкамі выступілі настаўнікі школ— фізікі, хімікі, біёлагі і іншыя. Асабліва часта выступаюць з дакладамі на такіх навуковых канферэнцыях члены кафедр марксісцка-ленінскай філасофіі (загадчык кафедры В. І. Сцяпанаў), навуковага камунізму (М. Р. Круцько), гісторыі КПСС гуманітарных факультэтаў (У. М. Сікорскі) і многіх іншых.

Нярэдка практыкуюць і калектыўныя выезды груп вучоных універсітэта на прамысловыя прадпрыемствы гарадоў рэспублікі. У мінулым годзе было здзейснена 10 такіх выездаў. Не менш іх і сёлета. Толькі за чатыры месяцы 1973 года арганізавана шэсць такіх выездаў— на мінскія трактарны і падшыпнікавы заводы, у гарады Дзяржынск, Асіповічы і іншыя. Цікавым быў выезд вучоных на МАЗ 19 красавіка, прысвечаны дню нараджэння У. І. Леніна. Для інжынерна-тэхнічных работнікаў, рабочых і служачых завода былі прачытаны лекцыі «Ленінскія прынцыпы аховы прыроды», «Вобраз Леніна ў савецкай літаратуры», «Ленінскі план пабудовы сацыялізму ў СССР», «У. І. Ленін—новы тып дзяржаўнага дзеяча», «У. І. Ленін аб рэлігіі» і іншыя.

Многа лекцый было прачытана выкладчыкамі універсітэта да Дня Савецкай Арміі. Члены таварыства «Веды» ваеннай кафедры выступілі перад насельніцтвам, у музеі гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, ва ўстановах, на прадпрыемствах.

З кожным годам усё шырэй прыцягваюцца да прапаганды ведаў студэнты старэйшых курсаў. Сваё лектарскае майстэрства яны павышаюць у школе маладога лектара. Перш чым выступіць перад насельніцтвам, яны праходзяць лектарскую практыку на занятках у гэтай школе, а пасля ў студэнцкай аўдыторыі. Добрымі распаўсюджвальнікамі ведаў зарэкамендавалі сябе студэнты факультэта прыкладной матэматыкі, фізічнага і гістарычнага факультэтаў. Асабліва часта выступаюць студэнты ў школах Мінска і вобласці. Напрыклад, толькі за адзін месяц напярэдадні святкавання 50-годдзя СССР студэнтамі гістфака было прачытана па юбілейнай тэматыцы больш 150 лекцый.

Разам з выкладчыкамі студэнты актыўна ўдзельнічаюць і ў агітпаходах, агітпрабегах, што адбываюцца не толькі па маршрутах Беларусі, але і братніх рэспублік. На усім шляху следавання студэнты чытаюць лекцыі, выступаюць з канцэртамі, наладжваюць дыспуты, гутаркі.

Вялікія планы ў членаў таварыства «Веды» на будучае. З новага навучальнага года пачне дзейнічаць лекторый «Новае ў астрафізіцы» для студэнтаў і выкладчыкаў БДУ. Тут з лекцыямі выступяць буйнейшыя вучоныя краіны, такія, як член-карэспандэнт АН СССР І. С. Шклоўскі, і іншыя. Плануецца рэарганізаваць народны універсітэт прававых ведаў, які стане галаўным у горадзе, і адкрыць метадычны — для работнікаў народнай асветы — па пытаннях маралі і маральнага выхавання моладзі. Дарэчы, такую секцыю ўжо вядуць выкладчыкі кафедры гісторыі філасофіі і логікі ў Заводскім раёне.

Узмацняцца сувязі нашага таварыства «Веды» з вучонымі іншых вну рэспублікі, асабліва з Мінскім медыцынскім інстытутам. З апошнім плануецца абмен лекцыямі па актуальных праблемах навукі. Прынясе немалую карысць і абмен лектарамі на факультэтах у самім універсітэце, асабліва паміж факультэтамі гуманітарнага і прыродазнаўчага профілю.

З кожным годам у арганізацыю ўліваюцца ўсё новыя сілы — выкладчыкі, аспіранты, студэнты. Паўсядзённа накопліваючы вопыт лектарскага майстэрства не толькі ў студэнцкіх, але і ў заводскіх аўдыторыях, яны яшчэ лепш выконваюць сваю пачэсную місію — прапагандыстаў ведаў.

**М. РЭЗНІКАЎ,**
**старшыня таварыства «Веды» універсітэта.**



# ЁСЦЬ ТАКАЯ ПРЫГАЖОСЦЬ...

«Родны мой геафак! Я прывезла сёння да цябе на сустрэчу сваіх вучняў СШ № 6 горада Клайпеды. Хачу, каб ты стаў для іх такім жа дарагім, як і для мяне».

Ці выпадкова менавіта ў музеі геалогіі геафака пакінула такі запіс былая выпускніца факультэта Н. Капціловіч? Мусіць, палічыла — і не без падстаў, — што толькі тут, як нідзе больш, раскрываецца прыгажосць і паэтычнасць прафесіі географа. І менавіта адсюль пачала знаёміць сваіх выхаванцаў з геафакам.

Такіх запісаў у кнізе водгукаў шмат. За знаёмства з незвычайнасцю дзякуюць выпускнікі факультэта, школьнікі, студэнты, настаўнікі, проста аматары-калекцыянеры. Тут пабывалі экскурсіі з беларускіх школ, студэнты Калінінграда, Львова, Балгарыі, ГДР, Афрыкі.

Музей геалогіі геаграфічнага факультэта — свайго роду унікальны. Ён адзіны ў Беларусі мае такую колькасць і разнастайнасць экспанатаў. Тут сабраны рэдкія ўзоры мінералаў і горных парод СССР.

Пачынаўся музей у 1923 годзе з калекцыі прафесара Бліадуха, падоранай факультэту. Непасрэдна адкрыты быў у 1934 годзе. Існаваў да 1941 года. У гады вайны вялікая частка экспанатаў загінула. Адраджэнне музея пачалося ў 50-х гадах. Музей цяпер мае чатыры аддзелы: мінералаў і горных парод, геалагічнай гісторыі Зямлі, карысных выкапняў БССР і чацвярцічнай геалогіі БССР.

Калі пралістаць кнігу водгукаў, можна заўважыць: у кожным запісе — прама ці ўскосна — наведвальнікі дзякуюць загадчыцы музея Э. А. Анімпадзіставай за вялікую і з любоўю выкананую работу.

Калі вы зойдзеце ў музей, абавязкова пагутарце з гэтай хударлявай, на дзіва прыемнай жанчынай. Тады вы будзеце задаволены ўдвая: доўга будзе хораша і светла ад таго дзіўнага багацця прыроды, якому нельга не здзіўляцца, і ад рэдкай па сіле і шчырасці закаханасці ў гэтыя прыродныя цуды гаспадыні музея. Каля шасці год Эма Андрэеўна аддала гэтым вітрынам з дзівоснымі каменнямі, гэтай спецыфічна музейнай цішыні і ўтульнасці. Дарэчы, утульнасць — справа яе рук. На ёй жа ляжаць і гаспадарчыя справы: гэтак жа, як пра рэдкі экспанат, прывезены з Сахары, яна скажа пра столік: «За ім ездзіла ў Баранавічы». Яна ў музеі адна, і прыходзіцца часам займацца зусім не сваёй работай, хоць непасрэдна музейных спраў вельмі многа.

— Дапамагаюць студэнты. Не ўяўляю, што б я без іх рабіла... Студэнты сапраўды многа працуюць у музеі: разбіраюць калекцыі фондавых матэрыялаў, вызначаюць узоры, рыхтуюць выставачныя вітрыны. Не аднойчы на дзень да Эмы Андрэеўны заглядваюць яе памочнікі: ці за парадай, ці з прапановай. Такая дапамога карысна і для музея, і для саміх студэнтаў — гэта іх выдатная практыка.

Уважлівае вока заўважыць, што мінералы і пароды на вітрынах раскладзены не адвольна. Улічаны і асвятленне, і ўласцівасці кожнага экспаната. Гэта выклікае не толькі пазнавальнае задавальненне, але і эстэтычнае.

— Вітрыны самі па сабе добра аглядаюцца, а дабаўленне святу дае яшчэ большы эфект...

Таму, відаць, і з'яўляецца адразу ж пры ўваходзе адчуванне нечага казачна-невядомага. І, напэўна, многіх з тых, хто выпадкова адкрыў дзверы, зачароўваў шкляны свет музея. Не-не, ды і гучыць ад парога: «Паглядзець можна?»

— Людзей прыходзіць многа. За адзін месяц звычайна да 13 экскурсій. А яшчэ нашы студэнты-географы... Сёння вось павінна прыйсці група з педінстытута... Прыходзяць аматары. Часам проста так прыходзяць, часам прыносяць пароды, просяць дапамагчы вызначыць.

Эма Андрэеўна ведае, якіх наведвальнікаў што цікавіць. Школьнікам патрэбны адны тлумачэнні, настаўнікам з інстытута ўдасканалення — другія, студэнтаў-фізікаў цікавіць адна нейкая ўласцівасць мінерала, біёлагаў — другая.

Музей адкрыт кожны дзень. І для ўсіх. Вярнуўшыся нядаўна з ленінградскай камандзіроўкі, Эма Андрэеўна са здзіўленнем прызналася, што ад музея ЛГУ чакала большага. Яе можна зразумець: кожны дзень сустракаючы ў сваім музеі наведвальнікаў, расказваючы ім пра каменнае багацце прыроды, непрывычна бачыць, што недзе гэтае багацце — дарэчы, больш поўна прадстаўленае — не імкнуцца паказаць людзям.

Трэба мець сапраўдны талент — інакш гэта не назавеш, — каб за столькі гадоў працы не згубіць першапачатковае захапленне прадметам сваёй прафесіі, не развучыцца здзіўляцца яму.

— Якія там калекцыі! — ці то з захапленнем, ці то са шкадаваннем, што нельга мець іх у сябе, расказвала Эма Андрэеўна пра музей Горнага інстытута. — У мяне і цяпер яны перад вачыма. Як у казцы. Не верыцца, што прырода такое стварае...

Зразумела, музею яшчэ расці і расці. Калекцыі звычайна папаўняюцца за кошт матэрыялаў, прывезеных студэнтамі з практыкі. Ёсць пароды, падораныя пастаяннымі наведвальнікамі музея. (Дарэчы, гэта яшчэ адзін са шматлікіх бакоў работы музея: аматары прыходзяць да Эмы Андрэеўны за парадамі. Яна дапамагае ім складаць маршруты паездак, паходаў, дапамагае вызначаць сабраны матэрыял). Падтрымліваюцца сувязі з музеем ЛГУ. Музей падарыў калекцыю Гомельскаму універсітэту, Упраўленню геалогіі БССР, састаўлены калекцыі для сярэдніх школ.

— Цяпер жа музей не папаўняецца. Не хапае памяшкання. Калі б нам яшчэ адзін пакой...

У музеі выстаўлена да дзвюх з паловай тысяч мінералаў і 200 узораў горных парод. Гэта — не ўлічваючы вучэбнай і асноўнай калекцый. З-за недахопу месца не выстаўлена цікавая калекцыя каштоўных і паўкаштоўных каменняў.

«Ён... павінен быць яшчэ больш прадстаўнічы» — запісаў у кнігу водгукаў начальнік аддзела Бел. НДГРІ Ю. Г. Копысаў. Напэўна, гэтая праблема практычна можа быць вырашана, улічваючы унікальнасць музея і яго значэнне. Чатыры аддзелы музея раскіданы па паверхах. Вядома, што, размешчаныя на калідоры, яны не могуць, як хацелася б, уздзейнічаць на гледачоў.

Музей можа і павінен стаць сапраўдным даведнікам па геалогіі СССР. Тым больш, што наведваюць яго з цікавасцю. А колькі яшчэ цікавага і сапраўды рэдкага матэрыялу можна было б выставіць!

Ёсць у кнізе водгукаў адзін кароткі і надзвычай шчыры запіс: «Калі б ведаў, што ёсць такая прыгажосць, не паступаў бы на юрфак».

Калі вы да гэтага часу ў няведанні праходзілі міма гэтай прыгажосці, то вярніце ўпушчанае.

**Т. ЗАСІМ.**

# Сёння—Дзень балгарскай асветы і культуры, славянскай пісьменнасці і друку

**Напярэдадні другой сусветнай вайны ў капіталістычнай Балгарыі 25 працэнтаў насельніцтва было непісьменным. Штогод каля 100 000 дзяцей школьнага ўзросту не мелі магчымасці наведваць школу.**

**Цяпер у Балгарыі ліквідавана непісьменнасць, у краіне ёсць 4 807 навучальных устаноў, у якіх вучыцца 1 600 000 чалавек. Па даных ААН, яна займае першае месца ў свеце па працэнту людзей, атрымаўшых сярэднюю адукацыю.**

**У 18 гарадах Балгарыі працуюць 28 вышэйшых навучальных устаноў і 24 настаўніцкія інстытуты, у якіх займаюцца больш 100 000 студэнтаў.**

**У буржуазнай Балгарыі на 10 000 жыхароў прыходзілася 16 студэнтаў, сёння—120.**

**У параўнанні з 1939 годам цяпер у Балгарыі вучыцца дзяўчат у 15 разоў больш. Жанчыны складаюць 51,8 працэнта агульнага ліку студэнтаў.**

**За гады народнай улады падрыхтавана больш 170 000 спецыялістаў з вышэйшай адукацыяй.**

**У краіне ёсць 427 навуковых цэнтраў, у тым ліку 173 навукова-даследчыя і праектна-канструктарскія інстытуты. У іх працуюць 13 874 навуковыя работнікі.**

**У краіне ёсць 156 музеяў.**

**Лік бібліятэк дасягнуў амаль 11 000. Яны налічваюць каля 50 мільёнаў экземпляраў кніг.**

**У рабочых клубах і дамах культуры дзейнічаюць 470 харавых і 250 танцавальных калектываў, 80 мастацкіх калектываў, 180 аркестраў.**

# МІНУЎ ГОД...

Набліжаецца к канцу вучэбны год, першы год іх вучобы ў БДУ, першы год знаходжання ў Савецкім Саюзе. Іх 30. Трыццаць балгарскіх юнакоў і дзяўчат, якія прыехалі ў нашу рэспубліку, каб атрымаць спецыяльнасць. Сямёра з гэтай групы — студэнты I курса факультэта прыкладной матэматыкі.

Па-рознаму адбылося першае знаёмства з СССР у Ронкі Велевай і Ілі Казаларскага. Ронка ў мінулым годзе скончыла школу ў Сафіі, з поспехам здала конкурсныя экзамены і была накіравана на вучобу ў Мінск. Іх сям'я і раней была звязана з нашай краінай: бацька Ронкі ў ліку другіх балгарскіх спецыялістаў некалькі год працуе ў Савецкім Саюзе, таму Ронка і пазнаёмілася з СССР яшчэ раней — завочна.

Іля Казаларскі здаваў конкурсныя экзамены ў 1970 г. Пасля іх былі яшчэ два гады службы ў арміі. І вось ён — студэнт БДУ. За год вучобы пазнаёміўся з Беларуссю, яе бытам, людзьмі. Пабываў у Маскве — «Такі цудоўны горад!»— Брэсце, Кобрыне, калгасах Вілейшчыны. Хутка здбудзецца паездка ў Хатынь. Яшчэ адно падарожжа чакае наперадзе — Ленінград. Аб гэтым горадзе расказвалі Ілі яшчэ дома, у Балгарыі, яго стрыечныя браты, якія некалькі гадоў таму назад вучыліся ў Ленінградзе і цяпер працуюць у Балгарыі. Пабываць у горадзе рэвалюцыі Іля даўно марыў. А на наступнае лета ён марыць паехаць працаваць з будаўнічым атрадам...

Пакуль жа ў іх лекцыі, семінары. Набліжаецца сесія. Але з ліміту вольнага часу выкройваюцца хвіліны на тое, каб наведаць тэатр, паглядзець «А світанні тут ціхія», пастаяць у захапленні перад карцінамі ў мастацкім музеі, пагуляць у бадмінтон на інтэрнацкім стадыёне.

Паездкі, сустрэчы, знаёмствы будуць цудоўным успамінам аб годзе жыцця ў Беларусі, невычэрпнай тэмай для расказаў у час канікулаў у Сафіі, Кнежы або Белай Слаціне.

**Т. КОСЦІНА.**





*Разам з савецкімі студэнтамі паглыбляюць свае веды па гісторыі КПСС і студэнты, якія прыехалі вучыцца ў БДУ з-за мяжы.*

*НА ЗДЫМКАХ: ідуць чарговыя семінарскія заняткі па гісторыі КПСС на I курсе ФПМ. На пытанні выкладчыка А. В. Ераксіна адказваюць балгарскія студэнты Ронка Велева і Іля Казаларскі.*

*Фота Д. Чаховіча.*



# З балгарскай паэзіі

**УЛАДЗІМІР ГОЛЕЎ**

***

Якім чароўным зеллем ты ўспаіла
мяне, зямля за краем небасхілу,
што дзе ні еду, ні іду па свеце—
тваіх далін мне ўсюды пахне квецень,
і ўсюды бачны мне ля паднябесся
твае вяршыні ў промнях успамінаў,
і да цябе ўсё цягне,
да цябе ўсё...
Якім жа зеллем ты мяне ўспаіла?

**ДЗІМІТР МЯТОДЗІЕЎ**

**РЭКІ**

Пра вусце марачы, з малой крыніцы
пачатак рэкі буйныя бяруць.
Яны цякуць, каб дзесь у моры зліцца.
Але—асобна па зямлі цякуць.

Ім так і плыць, не ведаючы зморы,
каціць на хвалях радасць і бяду.
Але ўва мне зліліся, нібы ў моры,
патокі рэк, з якіх я п'ю ваду.

Я п'ю ваду і з Волгі, п'ю і з Сены,
і з Жоўтае ракі я п'ю ваду.
Спрачаюцца ў маёй крыві усе яны,
як рэкі веку, праз які іду.

**АНДРЭЙ ГЕРМАНАЎ**

**ЛІРЫЧНЫЯ МІНІЯЦЮРЫ**

Баюся поцемкаў, баюся бруду,
баюся хлеба, што даюць дарма,
і шмат чаго яшчэ баяцца буду,
ды страху большага ў мяне няма,
як страх падумаць, што аднойчы дзеці,
якім я даў жыццё і нораў свой,
мяне спалоханым запомняць дзесьці
або прыніжаным перад самім сабой.

***

Я ўсё яшчэ нашу між пальцаў цёплы,
як прысак, пыл прасёлкавых дарог,
і помніцца мне пах густых канопляў,
і ў звечарэлым лузе свежы стог,
ласкавай рэчкі Камчыі пясочак,
мясістай дыні вабны халадок,
бароды водарасцяў, грай сарочы,
на дрэве першы залаты лісток,
ля вогнішча падпасак неабуты...
О, беднасці багатай успамін!
Калі забуду, што я з тых раўнін,—
я згіну сам. Без іх нішто я буду!

***

О, як нямнога сёння трэба мне!
Вярнуцца да парога нізкай хаткі,
ва ўтульны двор, рамонкамі зарослы,
і, лёгшы на спіну, раскінуць рукі
і памаўчаць, паслухаць цішыню,
глядзець на белую хмурынку ў небе
і ведаць—яшчэ мама маладая,
і крыж-умяціна ў траве густой
ёсць проста крыж, які пакінуў хлопчык,
няведаннем багаты і шчаслівы...

**Пераклаў Ніл ГІЛЕВІЧ.**

# У ЗАМЕЖНЫХ АЎДЫТОРЫЯХ

Нядаўна вярнуўся з паездкі ў НРБ дацэнт кафедры навуковага камунізму І. С. Сямыкін.

У Сафіі, гарадах Враца, Лом, Чырпраўцы, у вёсках ён выступіў з лекцыяй «Савецкі народ як новая гістарычная супольнасць людзей». Слухачамі беларускага лектара былі прадстаўнікі партыйна-гаспадарчага актыву сталіцы, студэнты-гісторыкі Сафійскага універсітэта, інжынерна-тэхнічныя работнікі навукова-даследчага інстытута чыгуначнага транспарту, працаўнікі сельскіх кааператываў.

М. БЕЛЫ.

# ПРАЦОЎНЫ ЭКЗАМЕН

На будаўнічую пляцоўку байцы атрада сабраліся хутка. Атрымаўшы заданне, яны раздзяліліся на брыгады і адразу ж прыступілі да работы. Працавалі зладжана, з энтузіязмам: многія ў СБА былі не першы год, авалодалі некалькімі сумежнымі прафесіямі і мелі добрую загартоўку. Я глядзеў на захопленых работай хлопцаў, і мне ўспомніўся адзін дзень...

Была спякотная жара. Нават у цяню пот залівау вочы. Закончылася першая палова дня. Паабедаўшы, хлопцы пайшлі адпачыць. Кожны быў заняты нечым сваім: хто чытаў, хто пісаў пісьмы, а хто проста ляжаў. Гэта быў звычайны дзень атрада, але раптам...

— Пажа-а-р!..

Голас прагучаў надзвычай моцна, так, што некаторыя ўздрыгнулі.

Гарэў толькі што здадзены будынак драўлянага інтэрната. І ўсе разумелі, што азначае пажар у такое надвор'е ў цэнтры сяла.

Хлопцы замітусіліся, кінуліся да выхаду.

— Без панікі! — прагучаў голас камандзіра. — Арганізаванасць перш за ўсё...

Спачатку перакрылі лінію, праз якую агонь мог пайсці далей, на бліжэйшыя будынкі, а асноўныя сілы былі кінуты на ліквідаванне ачагу пажару.

Дым не даваў дыхаць, было невыносна горача. Але рабяты з жорсткасцю змагаліся з агнём. І ніхто ні на хвіліну не спыніўся, пакуль агонь не быў збіт...

Праз некаторы час студэнты сабраліся на лятучку. Тут ужо не было той напружанасці, якая заўважалася на першых сходах. Адчувалася, што рабяты сталі больш згуртаваныя, упэўненыя ў сваіх сілах: было відаць, што працоўны дэсант паклаў пачатак стварэнню моцнага працоўнага калектыву.

**П. ГЕРАСІМОВІЧ,**
баец атрада «Спадчына» (ФПМ).

# ДАКРАНУЛІСЯ ДА МУЖНАСЦІ

Маё пакаленне, якое нарадзілася пасля вайны, ведае аб мужнасці абаронцаў Брэсцкай крэпасці, аб людзях, авеяных легендай, з расказаў ветэранаў вайны, кніг і кінафільмаў. І вось мне, разам з групай савецкіх і замежных студэнтаў, выпала шчасце 19 мая наведаць крэпасць-герой. Гэта была экскурсія, якую па традыцыі арганізуе падрыхтоўчы факультэт у канцы навучальнага года.

Гэтага дня мы чакалі і да яго рыхтаваліся. Студэнтам-іншаземцам яшчэ да ад'езду выкладчыкі чыталі лекцыі, праводзілі з імі гутаркі аб абаронцах крэпасці.

І вось доўгачаканы дзень прыйшоў. Мемарыяльны комплекс, як і ўвесь горад, патанае ў зеляніне і кветках. Цяжка паверыць, што ў грозныя дні 1941 года зямля тут была насычана крывёй абаронцаў, якія да апошняга дыхання заставаліся вернымі свайму сыноўскаму доўгу. Аб гэтым расказваюць дакументы музея. Аб гэтым расказваюць экскурсаводы. Фашысты так бамбілі крэпасць, што плавілася не толькі шкло, плавіліся цэгла і нават метал, але мужнасць і адвага не пакідалі савецкіх воінаў ні на секунду. Яны мmiралі, змагаючыся да апошняй кроплі крыві. «Памром, але не здадзімся! Бывай, Радзіма!» — з хваляваннем чыталі мы надпісы, пакінутыя абаронцамі крэпасці.





У музеі мы бачылі зброю, асабістыя рэчы герояў Брэста, адчулі сілу іх духу.

Пад шклом захоўваецца ржавы будзільнік. Стрэлкі спыніліся на лічбах 3.55 у тую раніцу 1941 года. Па залах людзі ходзяць ад рэліквіі да рэліквіі ў поўным маўчанні і роздуме. Якой воляй, вернасцю грамадзянскаму доўгу, воінскай прысязе і любоўю да Радзімы валодалі савецкія воіны! Іх вернасць, бясстрашнасць і адвага сталі для нас відавочным прыкладам.

Акрамя музея, мы агледзелі мемарыяльны комплекс, тэрыторыю крэпасці, помнікі. У той момант душой валодалі два пачуцці: боль і гонар за тое, што сёння людзі прыязджаюць з усіх куткоў планеты, каб схіліць галовы перад памяццю загінуўшых герояў. Ля падножжа помнікаў заўсёды ляжаць кветкі, іх шмат, і прыбаўляюцца яны з прыходам кожнага наведвальніка. Іх нясуць ветэраны вайны і працы, юнакі і дзяўчаты — камсамольцы 70-х гадоў, нясуць дзеці.

Усім хочацца дакрануцца да бессмяротнасці, аддаць даніну мужнасці, доблесці і гераізму абаронцаў крэпасці-героя. Мы помнім аб іх. Яны ў нашых сэрцах. Яны побач з намі сёння.

**З. УСАВА,**
**студэнтка І курса фізфака.**

# ПАМЯТНЫ ДЗЕНЬ

Як дамовіліся ўчора—збор а палове дзевятай ля інтэрната, што на Паркавай, дзе жыве большасць студэнтаў нашай групы. Раніца непагодная, і падумалася: добра, калі збярэцца палова групы. Але хваляванні былі дарэмнымі. Кожнаму хацелася паехаць у горад, які дае пуцёўку ў жыццё магутным БелАЗам, — у Жодзіна.

Наша знаёмства пачалося ў дарозе. З намі ехаў наш сябра і аднакурснік Валодзя Купрыенка, які доўгі час жыў тут. Колы аўтобуса зматваюць шэрую стужку шашы, а мы ловім кожнае слова Валодзі. І ўжо ведаем, колькі ў Жодзіна школ, як з'явіўся і заявіў аб сабе сённяшні славуты БелАЗ, радуемся таму, што ў горадзе аўтамабілебудаўнікоў у бліжэйшы час з'явяцца новы парк, новы кінатэатр і гандлёвы цэнтр. Ведаем, што жодзінцы першымі ў краіне сталі атрымліваць заработную плату не на заводзе, а ў ашчаднай касе...

І вось сустрэча з самім горадам. Калі наш гід, старшы інжынер-тэхнолаг завода Уладзімір Міхайлавіч Кундалевіч пачаў свой расказ, можна было падумаць, што мы знаходзімся не ў музеі Беларускага аўтамабільнага завода і слухаем не яго расказ аб гэтым прадпрыемстве, а казку. Цікавая гісторыя гэтага гіганта. Вось магутныя БелАЗы-540А, якія ўдастоены вышэйшай узнагароды за мяжой на Лейпцыгскай міжнароднай ярмарцы, а вось аўтапаязды БелАЗы-540 і 548. У першага грузападымальнасць 45 тон, а ў другога і таго больш. Побач БелАЗы грузападымальнасцю 75 і 120 тон. Цяпер канструктары працуюць над праектам аўтамабіляў на 180 тон.

— Пройдзе нямнога часу, — працягвае свой расказ У. М. Кундалевіч, — і наша прадпрыемства будзе выпускаць 500-тонныя аўтамашыны.

Тут, у музеі, розныя ўзнагароды БелАЗам, выразкі з газет, кнігі пра прадпрыемства, падарункі дэлегацый, фотапартрэты тых, хто стварае гэтыя магутныя машыны і кім па праву ганарацца на заводзе. Тысячы наведвальнікаў, савецкіх і замежных, пабывалі ў музеі за гады яго існавання.

...Цэхі нас сустрэлі звычайнай будзённасцю. Вось блок механічнага. Тут яшчэ мала што гаворыць аб абрысе магутных машын. Але праходзім далей: зварачныя і прэсавы цэхі, цэх галоўнага канвеера — і праглядваюць контуры машын. Самае цікавае, зразумела, як вырастаюць гэтыя гіганты. І таму больш за ўсё прыцягвае канвеер зборкі. Сёння тут збіраюць 27-, 40- і 45-тонныя самазвалы. За змену гэтае прадпрыемства выпускае 8—10 машын-гігантаў.

Былі ў нас гутаркі з тымі, хто дае пуцёўку ў жыццё машынам, слухалі мы перадачу заводскага радыё. Потым пазнаёміліся з самім Жодзіна, пабывалі на ГРЭС і заводскім стадыёне, ля помніка Пятру Купрыянаву, слухалі расказ пра чалавека вялікага сэрца і мужнасці—маці братоў і сясцёр Купрыянавых. З цікавасцю агледзелі Палац культуры аўтазавода.

...Дамоў вярталіся пад вечар. Кожны з нас быў у палоне таго, што ўбачыў і пачуў у маладым горадзе Жодзіна. Хочацца сказаць шчырае дзякуй нашым гідам У. М. Кундалевічу і А. П. Дзьячкову, усім жодзінцам за гэты дзень.

**І. СЦЯПУРА,**
**студэнт.**

# ДРУЖБЕ — МАЦНЕЦЬ

Ціхі майскі ранак. Толькі-толькі прайшлі першыя тралейбусы, абвяшчаючы гораду новы дзень адпачынку. А ля ўваходу ў галоўны корпус сабраліся групкамі юнакі і дзяўчаты. Смех, жарты. Гэта ўдзельнікі універсітэцкіх мастацкіх калектываў: народнай харавой капэлы і народнага танцавальнага ансамбля «Крыжачок». Ім выпаў пачэсны абавязак прадстаўляць самадзейнае мастацтва нашай старэйшай навучальнай установы ў Львоўскім ордэна Леніна дзяржаўным універсітэце імя Івана Франко. Так, у той сонечны нядзельны ранак яны адпраўляліся з візітам дружбы да нашых украінскіх сяброў. Яшчэ памятныя сакавіцкая сустрэча з дэлегацыяй львавян, выступленні ансамбля песні і танца «Чарамош», яшчэ не астыла ў памяці цяпло сяброўскіх усмешак, а сёння мы едзем у госці.



Аб Львове нагадвала ўсё:



і напружаныя гадзіны рэпетыцый, і свежыя запісы адрасоў у блакнотах, і нават прыгожыя новыя аўтобусы львоўскага завода. Усё спрыяла гэтай паездцы, накіраванай на мацаванне дружбы паміж нашымі універсітэтамі, паміж беларускімі і украінскімі студэнтамі.

...Магістраль быццам сама сцелецца пад калёсы. За вокнамі праносяцца вёскі, лугі, палі, рэчкі. У аўтобусах ціха. Некаторыя спяшаюцца даглядзець перапыненыя сны, некаторыя чытаюць. Студэнты ёсць студэнты. І не за гарамі самая адказная пара — экзаменацыйная сесія.

Дзяржынск. Стоўбцы. Баранавічы...

Стоп. Аўтобусы ідуць на запраўку. А ўдзельнікі народнай харавой капэлы праводзяць рэпетыцыю. Прама на ўзбочыне дарогі. Узмах рукі кіраўніка калектыву, лаўрэата сусветнага фестывалю студэнцкай песні ў Вене Вадзіма Барысавіча Сераброўскага — і чароўныя гукі павіслі ў паветры.

«Весна благоуханьем
дышит,
Трепещет дымкой небосвод.
Весна пришла, и сердце
слышит
Гармонию земли и вод...»

А на дрэвах, на прыдарожных кустах ужо распусціліся маладыя лісточкі. На ўзгорку пышна расцвіў калгасны сад. І здаецца, што сама прырода дапаўняе песню вядомага рускага кампазітара Бартнянскага.

І зноў дарога. Але сон як рукой зняло. Ды хіба ж можна заснуць! Адкладзены ўбок і кнігі.

— Толік, бяры гітару...

Гэта дзяўчаты. Угаворваць не трэба. І лепшы тэнар капэлы студэнт IV курса факультэта прыкладной матэматыкі Анатоль Новікаў ужо прывычна перабірае струны.

— Што спяём?

— «Місяць на небе».

Гэта сюрпрыз капэлы. Яна спецыяльна развучыла украінскую народную песню і вязе яе ў падарунак львавянам. І таму крыху хвалююцца спевакі. Але вось дзяўчаты меладычна зацягваюць песню, уступаюць альты, упрыгожваючы яе сваімі галасамі. Прыгожа пяюць тэнары, дапаўняючы мелодыю. А вось уступілі і басы, даючы акордам больш выразнае і поўнае гучанне. І плыве песня.

З цікавасцю паглядаюць на аўтобусы жыхары вёсак, праз якія мы праязджаем, усміхаюцца, махаюць услед рукой. Відаць, спадабалася песня. Але спыняцца нам некалі, нас чакае Львоў...

Сонца яшчэ толькі-толькі апусцілася за высокія і густыя львоўскія каштаны, як нашы аўтобусы пад'ехалі да будынка універсітэта. Тут нас сустрэлі прадстаўнікі рэктарата, парткома, камітэта камсамола, прафсаюзнага камітэта. Шчырыя словы віншавання, сяброўскія поціскі рук, букеты кветак— што лепш можа сведчыць аб сяброўскіх адносінах нашых універсітэтаў!

Нас чакалі, рыхтаваліся да сустрэчы. Аб гэтым мы яшчэ раз пераканаліся ў студэнцкіх інтэрнатах, дзе нам і прадстаяла правесці гэтыя цудоўныя і незабыўныя дні.

Назаўтра адбылося першае знаёмства з горадам і ў першую чаргу з універсітэтам. Яго велічны будынак узвышаецца амаль у цэнтры горада, насупраць маляўнічага парку.

**А. РАКОВІЧ,**
**дацэнт, намеснік дэкана факультэта журналістыкі.**

**М. НІКІШЫН,**
**сакратар камітэта камсамола факультэта.**

(Заканчэнне будзе).

ФІЗКУЛЬТУРА І СПОРТ —

НАШЫ СЯБРЫ

# КРОС

Першы від самастойных заняткаў фізічнымі практыкаваннямі, які мы прапануем вашай увазе, — крос.

Бег здаўна з'яўляецца каштоўным сродкам захавання і ўмацавання здароўя. Як масавы рух бег у спакойным тэмпе, бег дзеля здароўя, або бег «трушком», атрымаў упершыню прапіску ў пачатку 60-х гадоў у Новай Зеландыі. Заснавальнікам сістэмы бегу «дзеля здароўя» стаў вядомы трэнер А. Лідзьярд, які падрыхтаваў шэраг вядомых ва ўсім свеце бегуноў на сярэднія і доўгія дыстанцыі. Хутка бег у спакойным тэмпе стаў папулярным у многіх кутках зямнога шара. Клубы аматараў бегу былі арганізаваны ў ГДР, Аўстраліі, Францыі, ЗША. У нас у краіне падобных клубаў таксама становіцца ўсё больш.

Прычына папулярнасці бегу ў спакойным тэмпе заключаецца ў яго станоўчым фізіялагічным уздзеянні на арганізм, даступнасці для чалавека любога ўзросту і зручнасці па часу — кросы можна рабіць у любы час дня і года. Для бегу не абавязковы спартыўныя пляцоўкі, стадыёны. Сквер, парк, вуліца — усё падыходзіць.

Пры бегу на свежым паветры ў спакойным тэмпе ўмацоўваецца сардэчна-сасудзістая сістэма. Спажыванне кіслароду павялічваецца ў некалькі разоў супраць звычайнага ўзроўню. Паляпшаецца абмен рэчываў, умацоўваюцца шкілетная мускулатура, звязкі, устанаўліваецца на больш высокім узроўні каардынацыя ўсіх сістэм арганізма. А. Гілмар, аўтар вядомай кнігі аб бегу, выдадзенай у Савецкім Саюзе, лічыць, што бег у спакойным тэмпе выклікае пастаяннае памяншэнне колькасці халестэрына ў крыві, паляпшае эластычнасць крывяных сасудаў.

Перш чым пачаць займацца бегам, трэба звярнуцца да ўрача, які можа даць параду аб велічыні нагрузкі, у пачатку пасільнай для вашага арганізма.

Пачынаць бег трэба з невялікай дыстанцыі — 100, 200, 300 м, у залежнасці ад вашай фізічнай загартоўкі. Прабягаць дыстанцыю рэкамендуецца ў спакойным тэмпе, дыхаючы ўвесь час носам. У далейшым пры бегу, адчуўшы задышку, неабходна запаволіць тэмп або перайсці на хадзьбу.

Паступова павялічваючы дыстанцыю, час бегу можна давесці да 30—40 мінут. Бег у спакойным тэмпе стварае базу для высокіх спартыўных вынікаў.

У заключэнне прывядзем прынцыпы «бегу дзеля здароўя» сістэмы А. Лідзьярда:

1. Бегаць рэгулярна 3—7 раз у тыдзень (у залежнасці ад наяўнасці часу).
2. Бегаць не напружваючыся, у спакойным тэмпе. Пры паяўленні задышкі або стомленасці пераходзіць на хадзьбу.
3. Бегаць у любы час сутак і ў любое надвор'е.
4. Пачынаць займацца бегам з маленькай прабежкі (1—3 мін.), паступова даводзячы час бегу да 30 мінут і больш, арыентуючыся на самаадчуванне.

Бег у спакойным тэмпе з'яўляецца незаменным сродкам умацавання здароўя, выпрацоўкі агульнай вынослівасці арганізма і яго загартоўкі.

**В. РЭЙЗІН,**
**ст. выкладчык кафедры фізвыхавання і спорту.**

* Працяг. Пачатак гл. у №№ 11, 14.

Рэдактар
А. А. НІКОЛЕНКА.

Наш адрас: г. Мінск, Універсітэцкі гарадок, геаграфічны корпус, п. 14. Тэлефон — 22-07-19.
АТ 06721 Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КП Беларусі. Заказ 641